# § 14. Асноўны Закон дзяржавы

## Чаму Канстытуцыя з’яўляецца Асноўным Законам дзяржавы?



**Дзеючая Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь**
(са зmяненнямі і дапаўненнямі па выніках рэферэндумаў 1996, 2004 гг.)

Ад лац. *constitutio* — будова, устанаўленне.




**Дзень Канстытуцыі — 15 сакавіка**

**Прэамбула** | **9 раздзелаў** | **146 артыкулаў**

### Асновы канстытуцыйнага ладу

**Артыкул 1** — Унітарная дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава

**Артыкул 2** — Чалавек, яго правы і свабоды з’яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы

**Артыкул 3** — Адзінай крыніцай улады з’яўляецца народ

**Артыкул 13** — Уласнасць можа быць дзяржаўнай і прыватнай

**Артыкул 17** — Дзяржаўнымі мовамі з’яўляюцца беларуская і руская

**Мець сваю дзяржаўнасць** → **Суверэнітэт** ← **Быць паўнапраўным суб’ектам сусветнай супольнасці**

Суверэнітэт — Неад’емнае права беларускага народа і прымета беларускай дзяржавы



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Канстытуцыя — Асноўны Закон дзяржавы.** **Канстытуцыя** (ад лац. *constitutio* — будова, устанаўленне) — гэта Асноўны Закон дзяржавы, які мае найвышэйшую юрыдычную сілу. Гэта азначае, што ўсе астатнія законы ў дзяржаве не павінны супярэчыць Канстытуцыі. Такое значэнне Канстытуцыя мае таму, што ў ёй вызначаецца дзяржаўны лад, замацоўваюцца правы, свабоды і абавязкі грамадзян, устанаўліваюцца паўнамоцтвы органаў дзяржаўнай улады.

Гісторыя канстытуцый ідзе каранямі ў глыбокую старажытнасць. Вядомыя вам законы Хамурапі ў Вавілоне і Салона ў Афінах можна лічыць праваобразамі, а сярэднявечныя зборы прававых нормаў — папярэднікамі сучасных канстытуцый.

Асаблівай і вельмі значнай падзеяй у гісторыі сярэднявечнага еўрапейскага права стала распрацоўка і прыняцце Статутаў ВКЛ (1529, 1566, 1588 гг.). Статуты мелі яскравую гуманістычную накіраванасць і былі вельмі прагрэсіўнымі для свайго часу (уводзілася адказнасць асобы толькі ў адпаведнасці з законам і судом, вялікі князь абавязваўся таксама выконваць законы дзяржавы). Статуты дзейнічалі больш за 300 гадоў і аказалі вялікі ўплыў на станаўленне прававых нормаў у шэрагу краін Усходняй Еўропы.

У чым падабенства структуры Статутаў і сучаснай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь?



Першай канстытуцыяй у сучасным сэнсе гэтага паняцця лічыцца прынятая ў 1787 г. Канстытуцыя ЗША, якая з папраўкамі дзейнічае і сёння. Другой у свеце і першай у Еўропе стала Канстытуцыя Рэчы Паспалітай, прынятая 3 мая 1791 г., якая дзейнічала чатыры гады.

У XX ст. у Беларусі было прынята пяць канстытуцый: 1919, 1927, 1937, 1978 гг. (Канстытуцыі БССР) і 1994 г. — Канстытуцыя



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Рэспублікі Беларусь (са змяненнямі і дапаўненнямі, прынятымі на рэспубліканскіх рэферэндумах 1996, 2004 гг.). Дзеючая Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь прынята 15 сакавіка 1994 г. Таму 15 сакавіка ў нашай краіне дзяржаўнае свята — Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Адкрыйце QR-код і вызначце па фрагменце постара, якім этапам развіцця і фарміравання галоўнага закона дзяржавы была прысвечана выстава «Шлях да Канстытуцыі», што праходзіла ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ў 2019 г. ■

**Асновы канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь.** Асновы канстытуцыйнага ладу вызначаны ў I раздзеле Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

У артыкуле 1 Канстытуцыі ўказваецца, што наша краіна — *унітарная дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава*.

*Унітарная* дзяржава характарызуецца тым, што на ўсёй яе тэрыторыі дзейнічае адзіная сістэма прававых нормаў і адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі ў складзе дзяржавы (вобласці, раёны, гарады) падпарадкоўваюцца цэнтральным органам улады.

*Дэмакратычнай* з'яўляецца дзяржава, у якой грамадзяне ўдзельнічаюць у яе кіраванні, стварэнні нормаў і правілаў дзяржаўнага жыцця, фарміраванні органаў улады. У Рэспубліцы Беларусь адзінай крыніцай улады з'яўляецца народ.

Беларусь таксама з'яўляецца *сацыяльнай* дзяржавай, якая імкнецца забяспечыць годныя ўмовы жыцця для ўсіх грамадзян. Сацыяльная дзяржава асабліва клапоціцца пра людзей, якія не могуць паклапаціцца пра сябе самі. Яна гарантуе атрыманне адукацыі, медыцынскага абслугоўвання, дапамогі ў выпадку хваробы, інваліднасці, страты працы і інш. Згодна з артыкулам 2 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, чалавек — найвышэйшая каштоўнасць дзяржавы і грамадства.

*Прававая дзяржава* — гэта дзяржава, у якой прызнаюцца і гарантуюцца правы і свабоды чалавека, забяспечваецца роўнасць



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

усіх перад законам, улада дзейнічае строга ў рамках закону і падпарадкоўваецца яму. Дзяржаўная ўлада ажыццяўляецца на аснове яе падзелу на заканадаўчую, выканаўчую і судовую. Дзяржава, усе яе органы і службовыя асобы дзейнічаюць у рамках Канстытуцыі і прынятага ў адпаведнасці з ёй заканадаўства. Дзяржава рэгулюе адносіны паміж сацыяльнымі, нацыянальнымі і іншымі супольнасцямі на аснове прынцыпаў роўнасці перад законам, павагі іх правоў і інтарэсаў. Яна адказная за захаванне гістарычна-культурнай і духоўнай спадчыны, свабоднае развіццё культур усіх нацыянальных супольнасцей, што жывуць у Рэспубліцы Беларусь. Рэлігіі і веравызнанні роўныя перад законам.

Дзяржаўныя мовы ў Рэспубліцы Беларусь — беларуская і руская. Сімваламі Рэспублікі Беларусь як суверэннай дзяржавы з'яўляюцца яе Дзяржаўны сцяг, Дзяржаўны герб і Дзяржаўны гімн. Сталіца Рэспублікі Беларусь — горад Мінск.







Самастойна абгрунтуйце выбар горада Мінска ў якасці сталіцы беларускай дзяржавы. Выкарыстоўвайце веды з гісторыі, геаграфіі і іншых вучэбных прадметаў. ■

**Структура Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.** Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь складаецца з прэамбулы (уводнай часткі) і 9 раздзелаў, якія ўключаюць 146 артыкулаў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Структура Канстытуцыі

| | |
|---|---|
| **Прэамбула** | Асноўныя ідэі і прынцыпы, з улікам якіх распрацавана Канстытуцыя |
| **Раздзел I. Асновы канстытуцыйнага ладу** | Агульная характарыстыка беларускай дзяржавы, пытанні грамадзянства |
| **Раздзел II. Асоба, грамадства, дзяржава** | Правы, свабоды і абавязкі чалавека і грамадзяніна |
| **Раздзел III. Выбарчая сістэма. Рэферэндум** | Прынцыпы выбарчай сістэмы і правядзення рэферэндуму (народнага галасавання) |
| **Раздзел IV. Прэзідэнт, Парламент, Урад, суд** | Статус і паўнамоцтвы дзяржаўных органаў — Кіраўніка дзяржавы, Парламента, Урада і органаў судовай улады |
| **Раздзел V. Мясцовае кіраванне і самакіраванне** | Прынцыпы ажыццяўлення мясцовага кіравання і самакіравання |
| **Раздзел VI. Пракуратура. Камітэт дзяржаўнага кантролю** | Органы нагляду за выкананнем заканадаўства і кантролю выканання рэспубліканскага бюджэту |
| **Раздзел VII. Фінансава-крэдытная сістэма Рэспублікі Беларусь** | Бюджэтная і банкаўская сістэмы, парадак фарміравання даходаў і расходаў дзяржавы |
| **Раздзел VIII. Дзеянне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і парадак яе змянення** | Месца і роля Канстытуцыі ў прававой сістэме, пытанні дзеяння Канстытуцыі і парадак яе змянення |
| **Раздзел IX. Заключныя і пераходныя палажэнні** | Тэрміны пачатку дзеяння асобных палажэнняў Канстытуцыі |



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Значэнне Канстытуцыі для жыцця грамадства і дзяржавы велізарнае. Асабліва важна, каб абвешчаныя ў ёй прынцыпы і нормы дзейнічалі і выконваліся, а прынятыя па канстытуцыйных пытаннях законы і іншыя прававыя акты строга адпавядалі яе зместу.**

1. Якім чынам у раздзеле «Асновы канстытуцыйнага ладу» раскрываюцца прыметы беларускай дзяржавы?
2. Якія асноўныя характарыстыкі беларускай дзяржавы і беларускага грамадства адлюстраваны ў дзяржаўных сімвалах Рэспублікі Беларусь?
3. У якім раздзеле Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь утрымліваецца наступнае палажэнне: «Рэспубліка Беларусь прызнае прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і забяспечвае адпаведнасць ім заканадаўства»?
4. Прааналізуйце структуру Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і растлумачце, чаму раздзелы Канстытуцыі размяшчаюцца менавіта ў такой паслядоўнасці. ■

Выканайце міні-праект «Першае слова гімна на карце»: стварыце карту краін Еўропы, на якой будзе адзначана першае слова (першы радок) гімна кожнай дзяржавы. Якія групы краін можна вылучыць паводле дзяржаўных гімнаў? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне